ника Золотой Орды в Хорезме Кутлуг-Тимура. Тюрабек-ханым была красива, добра, умерла молодой, и народ Хорезма считал ее святой, что отразилось и в облике мавзолея. Он не очень хорошо сохранился, разрушился его глазурованный купол бирюзового цвета, но даже по сохранившимся фрагментам внутренней отделки купола – а это тонкая мозаика со звездами и цветами – видно, какой любовью народа пользовалась эта женщина.

На территории заповедника есть и еще памятники, в том числе мавзолеи, минареты, ворота караван-сарая, мечети и другие строения. Археологические раскопки здесь были начаты в 1929 г., до этого все исследования велись в основном по древним рукописным источникам, что тоже позволило сделать немало интереснейших открытий, касающихся того, чем был в художественном отношении и какую роль в истории сыграл древний Ургенч.

# АСАБЛІВАСЦІ СЛАВЯНСКАГА БУДАЎНІЦТВА Ў ПАНЯМОННІ XI-XII СТАГОДДЗЯ

УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
Якубюк С. П., студэнт 2 курса лячэбнага факультэта
Кафедра сацыяльна-гуманітарных навук
Навуковы кіраўнік – к. гіст. н., дацэнт Сіткевіч С. А.

Панямонне – гэта гісторыка-этнаграфічны рэгіён, які ўзнік у межах сучаснай Гродзенскай вобласці. Першымі гэтую тэрыторыю засялілі балтскія плямены (ятвягі, літва і інш.). Пачынаючы з VI стагоддзя ў Панямонні з`яўляюцца новыя пасяленцы – славяне (усходняя галіна). Яны пачынаюць засноўваць свае пасяленні, асвойваць мясцовасць. У IX стагоддзі славянскія плямены, якія пражывалі ў межах сучаснай Беларусі, утварылі свае аб'яднанні: дрыгавічоў, радзімічаў і крывічоў. У выніку дрыгавічы амаль цалкам засялілі Панямонне. Для іх былі характэрны асаблівыя рысы ў будаўніцтве, па якіх яны легка адрозніваюцца ад іншых племянных аб'яднанняў, і гэтыя асаблівасці захоўваліся на працягу стагоддзяў.

Будаўніцтва ў дрыгавічоў заўседы пачыналася з выбара месца, на якім будзе новы дом. Паводле звычаяў нельга было выбіраць месца, на якім калісьці праходзіла дарога, дзе згарэла хата або знаходзілася лазня. Калі нічога з гэтага не было на месцы, то гаспадар насыпаў збожжа па вуглах будучага будынку і чакаў раніцы. Калі са збожжам усе было добра, то месца падыходзіла [1].

Пасля таго, як выбралі месца, патрэбна было падрыхтаваць матэрыял. Да гэтага славяне падыходзілі вельмі акуратна, таму што неправільна падабранае бярвенне магло забраць шчасце з дому. Найлепшым дрэвам для будаўніцтва лічыліся хвоя і лістоўніца, таксама выкарыстовалася елка. Нельга было выкарыстоўваць асіну, таму што яна лічылася нячыстым дрэвам. Гэтыя звычаі выкарыстоўваліся пры будаўніцтве жылля дрэгавічамі паўсюдна: і ў гарадах, і ў меньшых пасяленнях.



Репозиторий ГрГМУ

Найбольш старажытнымі гарадамі, заснаванымі дрыгавічамі ў Панямонні, з'яўляюцца  Ваўкавыск, Навагрудак, Гродна. Па матэрыялах праведзенных археалагічных даследванняў гэтых гарадоў у 1930-х – 1990-х гадах можна зрабіць вынік: у XI-XII стагоддзях на тэрыторыях  гарадоў у асноўным будавалі жыллё двух тыпаў –  паўзямлянкі і наземныя хаты [2, с. 22; 3, с. 47].

Паўзямлянкі былі выяўлены падчас археалагічных даследванняў ва ўсіх трох гарадах. Колькасць іх розная, але ў асноўным яны складаюць большасць знойдзенных жыллевых памяшканняў. Даўжыння іх ад 3,7 метраў да 5,6 метраў, шырыня ад 2,9 метраў да 3,7 метраў; паглыблены яны ў мацярык прыкладна на 1 метр, але ёсць і меньш паглыбленыя, над зямлей падымаюцца на 1–1,5 метра. Для будаўніцтва жылля выкарыстоўвалася бярвенне дыяметрам 10-12 сантыметраў. Дах размяшчаўся непасрэдна на сценах. Падлога была глінабітнай, амаль што ва ўсіх паўзямлянках. Абаграваліся яны печкай каменкай, якая палілася па-чорнаму. А таксама печка выкарыстоўвалася для прыгатавання ежы. Амаль што ўсе паўзямлянкі былі арыентаваны па баках света [4, с. 88].

Другім тыпам жылля з'яўляліся наземныя дамы; падчас даследванняў колькасць выяўленных меньшая. Даўжыня гэтых дамоў была прыкладна 4 метра, шырыня 3,5 метра. Падлога была глінабітнай, у адным з кутоў знаходзілася печка-каменка, якая таксама палілася па-чорнаму. Асаблівасць гэтага  жылля ў тым, што яно мела акенцы, памерам 20-40 сантыметраў [2, с. 24]. Колькасць іх была вельмі розная, напачатку яны зачыняліся невялічкай дошчачкай, потым зашкляліся.

Такім чынам можна зрабіць выснову аб тым, што у Панямонні было развіта будаўніцтва са сваімі асаблівасцямі, якія магчыма прасачыць напрацягу некалькіх стагоддзяў.  Будаўніцтва ў славян было нейкім асаблівым рытуалам, які перадаваўся праз пакаленні, магчыма таму і захавалася шмат этнаграфічных крыніц, якія даюць прадстаўленне пра жыццё ў мінулым і дапамагаюць выявіць тыя асаблівасці жылля.

ЛІТАРАТУРА:

1. Жизнь славян в древности [Электронный ресурс]. – Режим доступа: slawianie.narod.ru/str/kultura/kult04.html. –  Дата доступа: 22.09.2019.

2. Зверуго, Я. Г. Древний Волковыск (X–XIV вв.) / Я. Г. Зверуго. – Минск : Наука и техника, 1975. – 144 с.

3. Воронин, Н. Н. Древнее Гродно (По материалам археологических раскопок 1932–1949 гг.) / Н. Н. Воронин. – М. : Издательство АН СССР, 1954. – 239 с.

4. Седов, В. В. Славяне в раннем Средневековье / В. В. Седов. – М. : Институт археологии РАН, 1995. – 416 с.

Репозиторий ГрГМУ